*Агата Мацко*

# ЭТНАРЭЖЫСУРА І РЭЖЫСУРА АБРАДАЎ І СВЯТ

*Память... она сообщает нам о существовании прошлого и дает толчок к тому, чтобы воссоздать его.*

*Д. Варнер*

Тэарэтыкі мастацтва адзначаюць, што «побыт славянскіх этнасаў з першых этапаў іх існавання адрозніваўся своеасаблівасцю... з паганскіх часоў. Менавіта адтуль прыйшло глабальнае паняцце *ігрышча* - як калектыўная тэатралізаваная дзея на тэатральнай аснове, але з элементамі драмы» [ 1, с. 64]. Набыццё навагодняй елкі, упрыгожванне яе рознакаляровымі цацкамі, наведванне могілак на Дзяды ці Радуніцу, падрыхтоўка і адорванне падарункамі на дзень народзінаў, вяселля і г.д. - усё гэта чалавек робіць штогод, амаль што ў адзін і той жа час. Мы называем гэта традыцыяй - універсальнай формай фіксацыі, замацавання і выбарчага захавання тых ці іншых элементаў сацыякультурнага досведу. Тым не менш, кожны год традыцыя ў адбыванні гэтых звычайных святочных дзей відазмяняецца па шматлікіх прычынах: узрост, мода... 1 перш за ўсё традыцыю відазмяняе і творча дадумвае сам чалавек - «рэжысёр» жыцця свайго і жыцця сваіх блізкіх. Ёсць, аднак, сітуацыі, якія пазначаюць пераломныя кропкі існавання чалавека ці наваколля (нараджэнне, шлюб, пахаванне, змена сезонаў). Тыповыя паводзіны ў іх (як правіла) з часам змяняюцца мінімальна, бо з'яўляюцца р ы т у а л а м і - *наборамі сімвалічных дзеянняў у вызначаным часе і месцы.* Сімволіку рытуалаў, часам не зусім зразумелую, дэшыфруе этнічная культура - міфы, легенды і паданні, якія спрадвеку перадаюцца ў межах этнасу непісьмовым шляхам, шляхам фальклору. Этнічна афарбаваныя паводзіны супольнасці і асобы напрацягу традыцыйных свят падпарадкоўваюцца спецыяльнай драматургіі і рэжысуры - этнарэжысуры.

Этнарэжысура адрозніваецца ад пастановачнай рэжысуры нефальклорных свят і рэкрэацыйных (карпаратыўных ці муніцыпальных) імпрэз перш за ўсё сваімі непасрэднасцю і непаўторнасцю ў выкананнні: тут няма жорсткага сацыяльных прымусу, заказа і адраса. Паколькі яна адрасавана ці на «абслугоўванне» светапарадку, ці эстэтычнае задавальненне асобы (часам - адразу на першае і другое адначасова), штучныя пастаноўкі тут часцяком выглядаюць даволі абсурдна. Яны могуць нізвесці высокі (касмічны) кантэкст дзеяння да ўзроўня фарса. Па сутнасці, у сітуацыі калядавання, радзін, купалавання, вяселля этнарэжысёрам можна назваць кожнага з нас. Як вядома, фальклор адмаўляе падзел на артыста і гледача, у ім - гэта ўзаемазамяняльныя складовыя, якія існуюць у сімбіёзе. Чаму ж удзельніка вышэйпералічаных з'яў можна ахарактарызаваць менавіта як рэжысёра, а не проста носьбіта?

Рытуальнасць каранёвых народных звычаяў мае шматскладовую структуру, пабудаваную на светапоглядных дамінантах чалавека як біялагічнага віда і істоты, уключанай (у шырокім сэнсе) у біяцэноз свайго «матчынага» ландшафту. «Механіка» эксплікацыі этнічнасці (якая можа існаваць імпліцытна - не праяўлена) проста суадносіцца з трохступеннай арганізацыяй прафесійнай рэжысуры. Прафесіная рэжысура ж як спефыцічная дзейнасць мае трохступенную структуру: задумка і падрыхтоўка дзеі, пастаноўка дзеі і сам вынік - прэм'ера спектакля, канцэрта, ігрышча, абрадавай дзеі. Так адбываецца і ў жыцці, знітаваным з этнамадэлямі паводзін.

**Задумка абрадавай дзеі:** чалавек перыядычна прыгадвае, што трэба адсвяткаваць Каляды, наведаць вяселле сястры, пагуляць на Маслянцы, пабыць кумам у лепшага сябра і г.д.

**Падрыхтоўка абрадавай дзеі:** чалавек узгадвае, што ваўсіх пералічаных сітуацыях прынята рабіць, дадумвае пэўныя рытуальныя дзеі, выбірае стравы і напоі, збірае музычныя інструменты і т.д. Адначасова «ўключаныя ў традыцыю» асобы дакладна (па этапах дзеі) узгадваюць - якім чынам трэба святкаваць, якія прапяваць і прагаворваць словы. Гэта замяняе рэпетыцыі характэрныя для пастановачных (не фальклорных) форм і з'яўляецца асаблівасцю этнічнага, каранёвага, фальклорнага мастацтва.

**Пастаноўка** дзеі: чалавек выбірае месца, азнаямляецца з маршрутам, вызначаецца з часам і датай правядзення, набывае ўсе неабходныя прадметы, запрашае сяброў, знаёмых і гасцей.

**Прэм'ера:** пасля асэнсавання і ментальнага мадэлявання неўзабаве адбываюцца калядная вечарына-абыход, двухдзённае вяселле, купальская ноч, гасцяванне на радзінах і т.д.

Тэрмін «этнарэжысура» можа быць сугучным з тэрмінам «аўтэнтычная рэжысура», але, на мой погляд, гэта не адное і тое ж, і паміж гэтымі паняццямі існуе розніца. Паколькі этнарэжысёр - гэта, вядома, носьбіт пэўных культуры, этнастэрэатыпаў і моды, але яго творчасць накіравана не толькі на Сусвет, але і на свае асабістыя патрэбы і інтарэсы. А супольнасць (сябры, госці, сям'я), якая атачае суб'екта рэжысуры, з'яўляюцца адначасова актыўнымі і пасіўнымі ўдзельнікамі абрадавай дзеі, задуманай «этнарэжысёрам». Што тычыцца аўтэнтычнай рэжысуры, то да яе адносяцца спантанныя рытуальна-абрадавыя, каляндарна-святочныя дзеі жыхароў вясковых асяродкаў - Вялікдзень, Купалле, Юр'я, Каляды, Дзяды і інш., памкненне да здзяйснення якіх закладзена напалову генетычна (нават можна сказаць, біялагічна).

Таму на сёняшні час ў святочным комплексе беларусаў можна выдзяліць тры віды рэжысёраў: аўтэнтычны рэжысёр, этнарэжысер і рэжысер абрадаў і свят. Самарэалізацыі і працы павінна хапіць усім, паколькі з канца XX ст. аналітыкі адзначаюць, што «адна з яркіх і характэрных прыкмет нашага часу - відавочная эстэтызацыя жыцця, актыўнае ўзрастанне ролі літаратуры і мастацтва ў духоўным узбагачэнні грамадства» [2, с.3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**

1. Салеев, В. Актерское мастерство: типология восточнославянских традиций / В. Салееў // Беларускае акцёрскае мастацтва: Шляхі станаўлення і развіцця ў кантэксце еўрапейскіх сцэнічных культур. Матэрыялы міжнароднай навукова-творчай канферэнцыі (Віцебск, 20-21 лістапада 1996 г.). - Мінск : Права і эканоміка, 1997. - С. 62 - 69.
2. Смольскі, Р.Б. Пазначана часам: Пошукі сучас. беларус. рэжысуры / Р.Б. Смольскі. - Мінск : Навука і тэхніка, 1984. - 88 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ